# Тэма: Дзяржаўны лад і сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель у ВКЛ (сяр.XIIIст. – сяр. XVIст.)

# План:

1. Дзяржаўны лад і кіраванне ў ВКЛ
2. Развіццё феадальных адносін у сельскай гаспадарцы. Тыпы і формы землеўладання і землекарыстання.
3. Станаўленне фальваркава – паншчыннай гаспадаркі. Аграрная рэформа 1557г. Асноўныя этапы юрыдычнага запрыгоньвання сялянства.

4. Беларускі феадальны горад. Магдэбурскае права і сістэма гарадскога самакіравання.Таварна – грашовыя адносіны.

# Эпоха феадалізму на тэрыторыі Беларусі

## IX -першая палова XIXст.

Феадалізм (ці феадальны спосаб вытворчасці, ад лац. уладанне) – грамадска-эканамічны лад, заснаваны на прысваенні феадаламі дадатковага прадукту шляхам эксплуатацыі сялян на аснове манапольнай уласнасці феадалаў на зямлю і няпоўнай – на непасрэдных вытворцаў.

# Асноуныя рысы феадалізму:

1. Панаванне натуральнай гаспадаркі;
2. Надзяленне непасрэднага вытворцы сродкамі вытворчасці і зямлёй з частковым ці поўным прымацаваннем яго да зямлі;
3. Асабістая залежнасць селяніна ад памешчыка (пазаэканамічны прымус);
4. Нізкі і руцінны стан тэхнікі.

# Асноўныя этапы ў гісторыі феадалізму на Беларусі

I перыяд - **Станаўленне і развіццё феадальных адносін**

**(IXст.-перш. пал. XVIIст.)**

II перыяд - **Пачатак разлажэння феадалізму і зараджэння капіталістычных адносін**

**(2-я палова XVIIст.- 2-я палова XVIII)**

III перыяд - **Крызіс феадальна- прыгонніцкіх аднсоін**

**(першая палова XIXст.)**

# Дзяржаўны лад Вялікага княства Літоўскага, Рускага, Жамойцкага

Манархія на чале з Вялікім князем (“гаспадаром”).

Манарху належала ўлада:

- заканадаўчая
- выканаўчая
- судовая
- вайсковая

Вялікакняжацкая Рада (паны-рада) – дарадчы орган

Сталіца -

→ Навагарадак (**сяр.XIII-1323г.)**

→ Вільна **( з 1323 г. да 1791г.)**

**Герб** → “Пагоня” (срэбранага колеру вершнік на шчыце чырвонага колеру).

(першы ўспамін у канцы XIII ст., афіцыйны – 1384г.)

**Дзяржаўная мова** – старабеларуская (мела назву “руская”), сучасная руская мова мела тады назву “маскоўская”.

# Эвалюцыя
# Рады ВКЛ

- сяр. XIII ст. – 1492г. – Вялікакняжацкая Рада ( паны – рада) дарадчы орган пры “гаспадары” з неакрэсленымі функцыямі і без пэўнага састава
- 1492г.- Прывілей Вялікага Князя Аляксандра – Рада (паны - рада) набывае статус заканадаўчага органа (разам з Вялікім князем)
- канец XVст.- фарміруецца новы заканадаўчы орган- СОЙМ

# *Падзел тэрыторыі ВКЛ па статусу зямель*

**ЛІТВА (цэнтральная, галоўная частка)-**

землі:

Ашмянская

Браслаўская

Берасцейская

Віленская

Вілкамірская

Ваўкавыская

Гарадзенская

Клецкая

Кобрынская

Капыльская

Лідская

Менская

Мсціслаўская

Нясвіжская

Навагрудская

Пінская

Рэчыцкая

Слонімская

Слуцкая

Трокская

Тураўская

Упіцкая

## Землі “ПРЫСЛУХОЎВАЮЧЫЯ” (мяжуючыя):

**Падляшша**

**Валынь**

**Падолле**

**Кіеўшчына**

**Чарнігава-Севершчына**

**Смаленскія**

**Віцебскія**

**Полацкія**

**Жмудзь і інш. на ўсход**

# Адміністрацыйна – тэрытарыяльнае дзяленне ВКЛ

## (з пачатку XVст. да 1565г.)



# Адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне ў 2-й пал.XVI-XVIIIст.

(пасля адміністрацыйнай рэформы 1565г.)



**ВЯЛІКАЕ КНЯСТВА ЛІТОЎСКАЕ ў другой палове XIV–XV ст.**




Аўтар В.Л.Насевіч

Великое княжество Литовское во 2-й половине 14—15 в.

# Арганізацыя кіравання ў ваяводстве




**<u>Глава адміністрацыі павета</u>** - стараста.

**<u>Глава адміністрацыі горада</u>** - войт.

**<u>Сельская адміністрацыя</u>** – цівун, сотнік, прыстаў, старцы і інш.

# Развіццё феадальных адносін у сельскай гаспадарцы. Тыпы і формы землеўладання і землекарыстання.

# Крыніцы фарміравання буйнога феадальнага землеўладання

ЗАХОП НЕЗАНЯТЫХ (СВАБОДНЫХ) ЗЯМЕЛЬ

ШЛЯХАМ КНЯЖАЦКІХ ПАДАРАВАННЯЎ

ЗАХОПЫ АБШЧЫННЫХ ЗЯМЕЛЬ ШЛЯХАМ ПРАМОГА НАСІЛЛЯ

# Вотчына

1) Комплекс феадальнай зямельнай уласнасці, які ўключае зямлю, пабудовы, жывы і мёртвы інвентар, і звязаных з зямельнай уласнасцю правоў на феадальна залежных сялян.

# Вотчына

- Арганізацыя з мэтай прысваення феадалам – вотчыннікам прыбавачнай працы залежных сялян, аснова панавання феадалаў у сярэдневяковым грамадстве.

# Структура вотчыны



# ТЫПЫ ВОТЧЫНЫ

- вялікакняжыцкія
- прыватна-уласніцкія
- манастырскія

# Галоўныя формы эксплуатацыі сялян у вотчыне



# Галоўныя заняткі насельніцтва ВКЛ ў эпоху феадалізму

- Земляробства
- Жывёлагадоўля
- Рамяство

## Дапаможныя заняткі

- Бортніцтва
- Паляванне
- Рыбалоўства
- Збіранне дзікарастучай прадукцыі

# Важнейшыя сельскагаспадарчыя (землЯробчыя)прыклады працы:

- Драўляная саха
- Плуг
- Рэшата
- Матыка
- Ступа
- Барана
- Рыдлёука
- Каса-гарбуша
- Серп
- Жорны
- Граблі
- Цэп

# Асноўныя сельскагаспадарчыя культуры

- Жыта(50% і больш)
- Пшаніца
- Авёс
- Ячмень
- Грэчка
- Лён
- Каноплі
- Проса

# Культуры на прысядзібных гародах

Рэпа

Агуркі

Бабы

Зеляніна

Гарох

# Асноуныя формы сялянскага землекарыстання

**“ДЫМ”** (ці“хлеб”, “саха”, “сялянскі двор”)

**“ДВОРЫШЧЫ”** (5-10 і больш “дымоў”)

“**СЕЛЬСКАЯ**(суседская)**АБШЧЫНА**(грамада) складаецца з “дымоў” і “дворышчаў”

**“ТЭРЫТАРЫЯЛЬНАЯ (ВАЛАСНАЯ) АБШЧЫНА”**

( некалькі сельскіх абшчын)

# Катэгоры сялян (у залежнасці ад павіннасцей у феадальнай гаспадарцы)

| Цяглыя | Асадныя | Агароднікі | Слугі |
| --- | --- | --- | --- |
| асноўная павіннасць - Паншчына+ Талокі, гвалты+ Натуральны аброк+ Невялікі чынш+ Фурманкавая+ Ахоўная павіннасць | Плацілі чынш да 30 коп літоўскіх грошай + да 12 талок і гвалтаў у год | Збяднелыя сяляне, працаваўшыя на трох моргах зямлі, адбываўшыя паншчыну | прывілеяваная частка сялян: Воіны Конюхі Лоўчыя Рыбакі Млынары, прымыкалі да шляхты |

# Збяднелыя (дэкласіраваныя)сяляне

Працавалі па найму

- Кутнікі
- Халупнікі
- Каморнікі
- Гультаі

# Катэгорыі сялян

# па ступені феадалььай залежнасці:

- ПАХОЖЫЯ (закупы, радовічы), мелі права пераходу ад аднаго феадала да другога;
- НЕПАХОЖЫЯ (атчызныя) пазбаўленныя права пераходу да другога феадала;
- ЧЭЛЯДЗЬ НЯВОЛЬНАЯ, поўная ўласнасць феадалаў, не мела зямлі і абслугоўвала дваровую гаспадарку

# Землі ВКЛ

## ДЗЯРЖАЎНЫЯ

### ВОЛАСЦІ

Адміністрацыiныя адзінкі

(ворыўныя землі у прыватным карыстанні сялян, а астатнія належалі абшчыне і выкарыстоўваліся калектыўна

Складаліся з некалькіх сёл

### ГАСПАДАРСКІЯ ДВАРЫ

(належалі непасрэдна вялікаму князю, кіраваліся яго адміністрацыяй і забяспечвалі княжацкі двор і казну)

## ПРЫВАТНА - ЎЛАСНІЦКІЯ

- Царкоўныя
- Панскія
  - панскія
  - княжацкія
- Шляхецкія

# Шляхі фарміравання феадальнага землеўладання (у XV-XVI ст. ст.)

**I** Вялікакняжацкія падараванні:

- а) часавое- «да волі», «да жывата», «да двух жыватоў», і г.д.( на тэрмін жыцця аднаго, двух ці некалькіх пакаленняў).
- б) «на вечнасць» ( з правам ці без права продажу)

**II** Дарэнні з боку буйных феадалаў васалам або царкве

**III** Купля-продаж

**IV** Залог (застава)

# Структура прыватнаўласніцкага феадальнага землеўладання ў ВКЛ (на 1528г.)



# Станаўленне фальваркава-паншчыннай гаспадаркі. Аграрная рэформа 1557г. Асноўныя этапы запрыгоньвання сялянства.

# Фальварак-

комплекс гаспадарчых і жылых пабудоў, вакол якіх размяшчаліся панскія землі, агароды, сенажаці, лясы, а таксама майстэрні, кузьні, лесапілкі і г.д., на якіх працавалі сяляне навакольных весак са сваім інвентаром і цяглавай сілай, арыентаваныя на рынак і развіцце таварна-грашовых адносін.

Першы фальварак на тэрыторыі Беларусі ўзнік у 1450г. ў маентку Менедыкаўскім Навагародскай зямлі.

Перш за ўсе фальваркава-паншчынныя гаспадаркі сталі ўзнікаць у Панямонні і Падзвінні ў рэгіенах сплаўных рэк з развітымі знешнімі рыначнымі сувязямі.

# Вялікая аграрная рэформа сярэдзіны XVI ст.

Ініцыятар правядзення- Вялікі князь Жыгімонт ІІ Аўгуст

Назва – «Валочная памера» (памера=землеўпарадкаванне)

Асноўны дакумент – «Устава на валокі» ад 1 красавіка 1557г.

Новая мера ўліку зямлі- «валока»(21,3 га)

Мэта рэформы – павышэнне даходаў з дзяржаўных зямель

Шляхі рэалізацыі мэты – а) дакладны ўлік сялянскіх зямель

б) абкладанне сялян павіннасцямі прапарцыянальна колькасці занятай зямлі і яе якасці.

в) дасканаленне агратэхнікі і арганізацыі сельгасвытворчасці.

# Асноўныя накірункі аграрнай рэформы 1557г. у ВКЛ:

1. Пераўлік і падзел ворыўных зямель на валокі.
2. Перадача валок зямлі:

   а) лепшых па якасці – пад вялікакняжацкія гаспадаркі;

   б) астатніх – сялянам у падворнае землекарыстанне.

3. Суадносіны памераў фальваркавага і сялянскага ворыва 1:7
4. Прымусовы трохпольны севазварот, што спрыяла росту ўраджайнасці.
5. Дакладна ўстаноўленыя павіннасці сялян:

   а) для цяглых (паншчынных) валочных надзелаў - апрацоўка паншчыны 2 дні на тыдзень, выхад на гвалты і талокі, выплата чыншу ад 6 да 21 гроша з валокі ў залежнасці ад якасці глебы

б) для асадных (чыншавых) валочных надзелаў-

выплата па 30 грошаў з валокі, адбыццё за год 12 талок або плаціць за іх 12 грошаў, а за гвалты даваць бочку жыта ці 10 грошаў.

Кошт павіннасцей з адной валокі сярэдняй якасці у год складаў значную суму, на якую можна было набыць на рынку 1 вала, 6 авечак, 1 свінню, 10 курэй і 4 гусей.

6. Страта права сялян на зямельныя участкі , якія былі раней у іх спадчынным валоданні.

7. Сварэнне рэзервовага зямельнага фонду з пустуючых валок.
8. Паступовае разбурэнне абшчыны (на захадзе Беларусі і ў цэнтральнай частцы- падворнае землекарыстанне, на ўсходзе - захаванне абшчыны).
9. Замацаванне сялян за зямлёй, ператварэнне розных катэгорый сялян у адзін клас- саслоўе – прыгоннае сялянства.

# Асноўныя этапы юрыдычнага запрыгоньвання сялянства ў ВКЛ

| Дата | Назва дакумента | Змест |
|---|---|---|
| 1447 г. | **Прывілей Казіміра Ягелончыка** | **Пацвяржаў прывілей 1387, 1432, 1434 гадоў, выдадзеныя шляхце ВКЛ, у тым ліку – права феадала на вотчынны суд над сялянамі** |
| 1468 г. | **Судзебнік Казіміра Ягелончыка** | **Страта сялянамі права свабоднага перахода ад феадала да феадала. Суровае пакаранне асоб за садзейнічанне пабегам “чэлядзі невольнай” і залежных сялян (арт. 24)** |
| 1529 г. | **Першы Статут ВКЛ (усеагульны звод законаў)** | **Страта сялянамі права ўласнасці на зямлю, распараджэнне ею толькі са згоды феадала** |

| Дата | Назва дакумента | Змест |
|---|---|---|
| 1557 г. | “Устава на валокі” | Замацаванне сялян за зямельнымі надзеламі (валокамі) |
| 1566 г. | Другі Статут ВКЛ | Увядзенне 10 гадовага тэрміну вышука беглых ці крадзеных сялян і адміністрацыйнага пакарання тых, хто хаваў іх у весцы ці горадзе |
| 1588 г. | Трэці Статут ВКЛ | Прадаўжэнне тэрміну адшуквання беглых сялян да 20 гадоў, канчатковае пазбаўленне сялян права пераходу. Пашырэнне правоў шляхты на прыгонных сялян. Канчатковае зацвярджэнне юрыдычнага запрыгоньвання сялянства |

# Асноўныя рысы феадальнай сістэмы ў ВКЛ (склаліся канчаткова ў 2-й палове XVI – першай палове XVII ст.)

1. Выключнае права феадалаў на валоданне зямлей.
2. Асобыя саслоўныя прывілеі і абавязкі шляхты.
3. Пазбаўленне сялян правоў на зямлю і замацаванне іх за зямлей.
4. Пазаэканамічнае прымушэнне сялян да працы.

# ***2 этапа развіцця грашовай сістэмы ВКЛ***

1. Рэгіянальныя грашова-вагавыя сістэмы (асноўная - полацка-віцебская)
2. Агульнадзяржаўная

## *Полацка-віцебская рэгіянальная грашовая сістэма ВКЛ (сяр. XIV ст.)*

1 ізгой (Літоўская грыўна) = 30 пражскіх грошаў(3,6 гр.)=
=180 заўшняў (па 0,6гр.) =
=300 далгеяў (па 0,4гр.)=
=108гр.

*1 РУБЕЛЬ* = 105 нагатаў (па 1,8г.)=
=52,5 грошаў =
=315 заўшняў =
=525 далгеяў=
= 189 гр.

## ***Агульнадзяржаўная грашова –вагавая сістэма ў ВКЛ (канец XV ст.)***

**1 рубель = 100 пражскіх грошаў =**

**=1000 пенязяў =**

**=180 гр.**

**У аснову грашова-вагавай сістэмы ВКЛ была пакладзена полацка-віцебская грашова-вагавая сістэма.**

# Органы кіравання горада з магдэбургскім правам у ВКЛ

